# Як у казцы прыйдзе Новы год…

У аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» адбылося сапраўднае навагодняе свята - з гасцямі, падарункамі і казачнымі персанажамі.

Навагоднія ўрачыстасці - гэта падзеі, якія з радасцю чакаюць і дзеці, і дарослыя. Ашмянскае РК ГА «БРСМ» сумесна са спецыялістамі ДУК «Ашмянскі РЦК» і пры падтрымцы пярвічных арганізацый ГА «БРСМ» «Ашмянскі мясакамбінат», ААТ «Будаўнік», ААТ «Гальшанскі крухмальны завод», КСУП «Гальшаны» павіншавалі з надыходзячым Новым годам выхаванцаў АДПІ. Наведвальнікі аддзялення сустрэліся з Дзедам Марозам і Снягуркай, з казачнымі героямі яны гулялі ў рухомыя гульні, удзельнічалі ў шоў мыльных бурбалак і вадзілі карагоды. Госці і ўдзельнікі свята атрымалі масу станоўчых эмоцый, зарадзіліся пазітыўным настроем і пераканаліся ў тым, што цуды здараюцца.

Старшыня Ашмянскай РК ГА «БРСМ» Вікторыя Прэцкайла-Місюта павіншавала ўсіх прысутных з надыходзячым Новым годам і Калядамі, а прадстаўнікі пярвічак уручылі навагоднія падарункі. Спецыялістамі АДПІ 30-31 снежня падарункі былі дастаўлены тым, хто не змог прысутнічаць на свяце.






